Козік, Л.А. Коротко о книге / Л.А. Козік // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 9. / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Мн.: БГУ, 2014. – с. 294. – JIŘÍ KNAPÍK, MARTIN FRANC A KOL. Průvodce kulturnm děnm a životnm stylem v Českich zemch. 1948 – 1967. Praha: Academia, 2012. Ve 2 sv. 1297 s. Sv. 1.: A—O; Sv. 2.: P—Ž.



**Jiří Knapík, Martin Franc a kol. Průvodce kulturním děním a životním stylem v Českich zemích. 1948—1967.** Praha : Academia, 2012. Ve 2 sv. 1297 s. Sv. 1.: A—O; Sv. 2.: P—Ž.

Двухтомны зборнік «Даведнік аб культурных падзеях і стылі жыцця ў Чэшскіх землях. 1948—1967» з'яўляецца вынікам працы вялікага калектыву чэшскіх даследчыкаў на чале з І. Кнапікам і М. Францам. Храналагічныя межы аўтары тлумачаць наступнымі падзеямі: у лютым 1948 г. адбыўся камуністычны пераварот, які пачаў новы этап у развіцці краіны і людзей. У сваю чаргу 1967 г. стаў апошнім годам «непахіснага» развіцця сацыялізму, на змену якому прыйшла Пражская вясна і спроба пабудаваць «сацыялізм з чалавечым тварам».

Даведнік пачынацца ўводнымі артыкуламі, якія раскрываюць як методыку працы чытача з кнігай, так і асаблівасці культурнага і паўсядзённага жыцця ў Чэхаславакіі ў 1948—1967 гг. У тэарэтычнай частцы даецца агульная характарыстыка перыяду і ў яго межах вылучаюцца этапы (1948—1950 гг. — фарміраванне сістэмы, 1951—1953 — крызіс рэжыму, 1954—1956 — змены прыярытэтаў рэжыму, 1957—1960 — «шызафрэнія сістэмы», 1961—1963 — гаспадарчыя праблемы, 1964—1967 гг. — пераход да спажывецкага грамадства з «чалавечым тварам»), апісваюць кіруючыя структуры і інстытуцыянальную базу культурнага і грамадскага жыцця, прадпрымаюць спробу выявіць асаблівасці «сацыялістычнага культурнага жыцця» краіны.

Аўтары адзначаюць, што развіццё культуры цесна было звязана з дзейнасцю такіх устаноў, як апарат КПЧ і падначаленыя яму органы, дзяржаўны апарат і міністэрствы. Не апошнюю ролю ў фарміраванні сацыялістычнага стылю жыцця адыгрывалі ўсеагульныя выбары ў Нацыянальны сход краіны.

Аўтары характарызуюць «так званую дэмакратызацыю» ў культуры, падкрэсліваюць ролю атэістычнай прапаганды і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў фарміраванні сацыялістычнага стылю жыцця, згадваюць барацьбу з «мяшчанскімі перажыткамі», асаблівасці арганізацыі культуры правядзення вольнага часу, адзначаюць уплыў замежнай культуры на чэшскае грамадства.

Тэарэтычная частка выдання адыгрывае важную ролю ў разуменні разглядаемых працэсаў, але, як падаецца, спецыялісты-даследчыкі з большым інтарэсам пазнаёмяцца з асноўным зместам даведніка, які прадстаўлены ў алфавітным парадку. Дарэчы, трэба адзначыць, што аўтары прыводзяць у першым томе і тэматычны паказчык прыведзеных паняццяў, што значна аблягчае працу з кнігай. Даведнік прадстаўляе самыя разнастайныя бакі жыццядзейнасці грамадства ва ўмовах сацыялістычнага ладу, а таму будзе цікавым і карысным не толькі для спецыялістаў, але і для аматараў гісторыі.

*Л. А. Козік*

**Igor Baka, František Cséfelvay, Peter Kralčáj a kol. Ferdinand Čatloš — vojak a politik (1895—1972).** Bratislava : Pro Militaria Historica v spolupráci s Vojenským historickým ústavom, 2011. 309 s.

Книга Игора Баки и коллектива авторов «Фердинанд Чатлош — военный и политик (1895—1972)», написанная в жанре политической биографии, посвящена видному словацкому политическому деятелю. Чатлош, участник Первой мировой войны на Восточном фронте, в сентябре 1915 г. попал в русский плен, в 1917 г. присоединился к Чехословацкому легиону. С 1918 г. на службе в чехословацкой армии. В 1926—1927 гг. — заместитель военного атташе в Будапеште.

В октябре 1938 г. возглавил военную канцелярию правительства автономной Словакии. Один из создателей словацких вооруженных сил. После провозглашения независимости Словакии 14 марта 1939 г. подполковник Чатлош занял пост министра обороны в правительстве И. Тисо и одновременно начальника Генштаба. В сентябре 1939 г. руководил словацкими войсками, участвовавшими в агрессии против Польши. Генерал (1939). Одно время имел сильные политические амбиции, первоначально поддерживал лидера националистической организации «Радобрана», премьер-министра и министра иностран-